Падтрымай "Вясну" на PATREON

Да трох гадоў "хіміі" асудзілі палітзняволенага мінчука за пяціхвілінную счэпку 9 жніўня мінулага году

30.11.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, палітвязні

Суд Заводскага раёна Мінска 29 лістапада асудзіў да трох гадоў "хіміі" 41-гадовага палітвязня Максіма Мікуліча. Яго абвінавацілі па ч. 1 арт. 342 Крымінальнага кодэксу (актыўны ўдзел у групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак) за ўдзел у акцыі пратэсту 9 жніўня мінулага года разам са сваім сябрам, былым палітзняволеным экс-амапаўцам Максімам Клімовічам, якога асудзілі за гэтыя падзеі да трох гадоў "хатняй хіміі". У счэпцы Мікуліч і Клімовіч патрапілі на фотаздымак, па якіх іх ідэнтыфікавалі і ўзбудзілі крымінальныя справы. Пасля трох з паловай месяцаў за кратамі палітвязень выйшаў на волю. Справу Мікуліча разглядала суддзя Алена Капцэвіч, дзяржабвінавачванне падтрымліваў пракурор Мікалай Дзяцел.



Максім Мікуліч (злева) і экс-палітвязень, яго сябра Максім Клімовіч. Фота: spring96.org

Максім Мікуліч быў затрыманы 17 жніўня разам з сябрам, за ўдзел у пратэстах мінулага года. Затым Мікуліча і Клімковіча да суда ўтрымліваліся ў СІЗА № 1 г. Мінска.

Згодна версіі абвінавачвання, Мікуліч *“прыняў актыўны ўдзел у групавых дзеяннях, якія груба парушылі грамадскі парадак, а менавіта – выкрыкваў лозунгі, гучна пляскаў у ладкі, не падпарадкоўваўся законным патрабаванняў супрацоўнікаў міліцыі спыніць супрацьпраўныя дзеянні. Удзельнічаючы ў счэпцы, наўмысна перашкаджаў руху грамадскага транспарту, блакаваў яго рух, чым нанёс матэрыяльныя страты прадпрыемству “Мінсктранс”.*

Сваю віну на судзе Максім Мікуліч прызнаў у поўным аб’ёме.

З матэрыялаў справы вядома, што ў ноч з 9 на 10 жніўня 2020 года знаходзячыся ў Мінску Максім Мікуліч сустрэўся з даўнім сябрам Клімовічам, пад’ехалі на аўтамабілі да гандлёвага цэнтра “Карона” і вырашылі прайсціся, каб паглядзець, што робіцца ў горадзе.

> *“Дайшлі да перакрыжавання праспекта Пераможцаў з Машэрава, людзей станавілася ўсё больш. Нехта схапіў нас за локці, сказалі давай пастаім у счэпцы на праезнай частцы. Я разумеў, што мы замінаем руху грамадскага транспарту, проста спрацаваў эфект натоўпу. Затым пачаўся хаос, сталі выбухаць светлашумавыя гранаты і мы сышлі адтуль*”, – тлумачыў у судзе Мікуліч.

У якасці доказаў у судзе былі прадастаўлены фота з розных рэсурсаў, на якіх бачна, што Мікуліч і Клімовіч стаяць у счэпцы і адзенне Мікуліча супадае з тым, што знойдзена ў ягоным доме.



Прадстаўнік “Мінсктранса” **Вікторыя Халіпава** прадставіла разлікі нанесенай прадпрыемству шкоды на суму 3 621 рубель.

У судзе выступіла маці абвінавачанага, якая станоўча ахарактарызавала сына, распавяла, што муж даўно памёр, а хатняй гаспадаркай, домам у вёсцы і дачай займаецца Максім, што ёй будзе цяжка без яго, бо муж даўно памёр.

На працэсе дапыталі сябра палітвязня Максім Клімовіч, які пацвердзіў паказанні Мікуліча, паколькі ўвесь час яны былі разам. Клімовіч быў асуджаны таксама за падзеі 9 жніўня мінулага года. 2 лістапада суд Маскоўскага раёна Мінска прысудзіў Максіму Клімовічу тры гады «хатняй хіміі» . Пасля двух з паловай месяцаў пад арыштам ён выйшаў на волю. На яго судзе ў кайданках дапытвалі Мікуліча.



Палітзняволенага экс-амапаўца асудзілі да трох гадоў "хатняй хіміі" за ўдзел у пратэсце

У судзе Маскоўскага раёна Мінска 2 лістапада паводле артыкула 342 Крымінальнага кодэкса да трох гадоў "хатняй хіміі" асудзілі палітвязня Максіма Клімовіча.

У ходзе судовых спрэчак пракурор Мікалай Дзяцел запрасіў для **Мікуліча тры гады абмежавання волі з накіраваннем ва ўстанову адкрытага тыпу.** Такі прысуд і агучыла суддзя Алена Капцэвіч. Пазоў “Мінсктранса” перададзены ў грамадзянскую судавытворчаць. Мікуліча адпусцілі на волю адразу пасля абвяшчэння прысуду.

Твитнуть



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брасце і Віцебску пасля рэйда па сацсетках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY